# Весці

**Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка**

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс. Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

**№ 2 (40) 2004**

**СЕРЫЯ 2.**
**Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія**



*Галоўны рэдактар:*
**П. Дз. Кухарчык**

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
В. А. Бондар
*(нам. галоўнага рэдактара)*
В. В. Бушчык
Ю. А. Быкадораў
*(нам. галоўнага рэдактара)*
М. С. Вайтовіч
А. М. Вітчанка
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
Т. А. Грыгор'ева
Л. М. Давыдзенка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
П. В. Кікель
Н. І. Копысава
*(адказны сакратар)*
Г. А. Космач
А. М. Люты
І. А. Новік
А. У. Рагуля
В. М. Русак
А. І. Смолік
В. Дз. Старычонак
М. Т. Стэльмашук
В. Б. Таранчук
І. С. Ташлыкоў
В. М. Фамін
А. Т. Федарук
Л. Н. Ціханаў
І. І. Цыркун
Л. Б. Шнеперман
У. А. Якавенка
М. Г. Ясавееў
М. С. Яўневіч


## Змест


### *Гісторыя*

**Да 60-годдзя вызвалення Беларусі**

*Караткевіч А. Ц.* Навечна ў памяці народнай ..... 3

*Каваленя А. А.* Аперацыя «Баграціён» ..... 5

*Валчок Г. І.* Узаемадзеянне партызан Магілёўскай вобласці з часцямі Чырвонай арміі ў ходзе беларускай наступальнай аперацыі... 7

*Канапацкі І. Б., Шкуцько Л. Л.* Садружнасць народаў СССР у перыяд вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў ..... 10

*Кузьменка У. І.* Інтэлігенцыя ў антыфашысцкай арганізацыйнай і палітычнай рабоце ў перыяд вызвалення Беларусі ..... 11

*Жылінскі М. Г.* Арганізацыя і праца савецкіх школ на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ..... 15

✧ ✧ ✧

*Мацюш П. А.* Навуковыя і навукова-педагагічныя кадры гісторыкаў Беларусі: дынаміка колькаснага росту ў 60 — пачатку 70-х гг. XX ст. ..... 21

*Пілецкі В. А.* «Гамераўскія» мужчынскія саюзы як адзін з элементаў фарміравання выхаваўча-адукацыйнага працэсу эпохі антычнасці ..... 23

*Лапановіч С. Ф.* Дзейнасць Тацццянінскага камітэта па аказанні дапамогі бежанцам у Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны ..... 26

*Фядковіч Г. І.* Дзейнасць балгарскіх інтэрнацыяналістаў у Кастрычніцкай рэвалюцыі і Грамадзянскай вайне ..... 29

*Сямёнава С. А.* Роля купецтва ў развіцці гандлю, прамысловасці і фінансаў Беларусі ў другой палове XVIII — першай палове XIX ст. ..... 31

*Крывуць В. І.* Удзел Войска Польскага ў рэалізацыі ўрадавай маладзёжнай палітыкі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 30-х гг. XX ст. ..... 35

*Важнік В. М.* Беларуска-польскае эканамічнае і гандлёвае супрацоўніцтва ў 50—70-х гг. XX ст. ..... 38

### *Філасофія*

*Кікель П. В., Маркіянава Н. П.* Выхаванне як аснова станаўлення будучага спецыяліста ..... 42

*Бліхарж Р. І.* Функцыі метадалагічных ведаў у навуковым даследаванні ..... 45


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вялікай Айчыннай вайны. Аднак у гэтай справе неабходна і далейшая навуковая карпатлівая праца навукоўцаў, пісьменнікаў, удзельнікаў вайны.

Да цяперашняга часу сусветная і айчынная гістарыяграфія абагацілася шматлікімі навуковымі працамі аб ваенных падзеях Другой сусветнай вайны. Беларускія гісторыкі ўнеслі свой уклад у распрацоўку розных аспектаў ваеннай гісторыі. У гэтым немалая заслуга Савета ветэранаў БДПУ, прафесараў, дацэнтаў, выкладчыкаў кафедр гісторыі і педагогікі. Навуковае абагульненне вопыту працы на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ўтрымліваецца ў трохтомным выданні «Усенародная барацьба ў Беларусі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны».

Значную навуковую каштоўнасць мае выданне шэрага архіўных зборнікаў дакументаў, а таксама розных даведнікаў, манаграфій, матэрыялаў навуковых канферэнцый, успамінаў ветэранаў.

Перад гісторыкамі рэспублікі стаіць задача па вывучэнні дакументаў нямецка-фашысцкіх ведамстваў, якія захоўваюцца ў архівах Рэспублікі Беларусь і іншых краін. У гэтых мэтах неабходна шырока выкарыстоўваць магчымасці абмену навуковымі работнікамі.

Усе мерапрыемствы па паляпшэнні навуковай распрацоўкі гісторыі барацьбы беларускага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў павінны садзейнічаць далейшаму ваенна-патрыятычнаму выхаванню нашага народа, асабліва моладзі. У гэтым заключаецца дзейнасць Савета ветэранаў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

Вялікі ўклад у распрацоўку ваеннай праблематыкі ўнёс А. М. Мацко, удзельнік партызанскага руху.

Асвятленнем пытанняў ваенных падзей у гады Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі займаецца шэраг выкладчыкаў гістарычнага факультэта. У гэтым заслуга М. Д. Каўшарава, які напісаў шмат дапаможнікаў і распрацаваў спецкурс па азначаным пытанні.

Навуковым абгрунтаваннем падзей Вялікай Айчыннай вайны і ваенна-патрыятычнага выхавання студэнтаў займаўся прафесар К. А. Кулінковіч — ініцыятар штогадовага правядзення «Зорных паходаў» студэнтаў па раёнах Мінскай вобласці і Рэспублікі Беларусь. Прафесар Кулінковіч некалькі год узначальваў Савет ветэранаў вайны і працы БДПУ, праводзіў шматгранную працу па ваенна-патрыятычным выхаванні як у калектыве універсітэта, так і за яго межамі.

Мінула больш за 59 год з дня Перамогі. Усё далей і далей адыходзіць у гісторыю гэта дата. Але па-ранейшаму непамерна вялікай паўстае перад намі самаадданасць савецкіх людзей, выратаваўшых чалавецтва ад фашызму. Народ Беларусі ніколі не забудзе ратны і працоўны подзвіг прадстаўнікоў усіх нацыянальнасцей нашай краіны.

Думкі і надзеі ўсіх нас звернуты ў мінулае, ужо стаўшае гісторыяй. Франтавікі, партызаны і падпольшчыкі, працаўнікі савецкага тылу ганарацца тым, што ў слаўнай сям'і гарадоў-герояў значыцца сталіца Рэспублікі Беларусь. 1100 дзён і начэй доўжылася фашысцкая акупацыя горада, жыхары якога змагаліся з ворагам, не шкадуючы сваіх жыццяў.

Пройдуць гады, дзесяцігоддзі, але ніколі не забудуць народы ўсяго свету непахісную мужнасць, выключную стойкасць савецкіх людзей у вызваленчай і справядлівай вайне. У нашай краіне свята ўшаноўваюць савецкіх патрыётаў, аддаўшых жыццё за свабоду і незалежнасць Айчыны. На плошчы Перамогі ў Мінску, у Хатыні, на Кургане Славы гарыць Вечны агонь. У многіх гарадах і сёлах Беларусі ўзвышаюцца манументы, абеліскі, мемарыялы, на іх ускладаюцца гірлянды, вянкі, букеты жывых кветак.

*SUMMARY*

*The facts about the destiny of the students, teachers and workers of the Minsk Pedagogical institute (named after A. M. Gorky), who took part in the Great Patriotic War, are given.*

*УДК 947.6*

***А. А. Каваленя***

# АПЕРАЦЫЯ «БАГРАЦІЁН»

Імкліва ляцяць гады... 3 ліпеня 2004 г. беларускі народ адзначае 60-годдзе вызвалення Беларусі ад германскіх акупантаў. Шэсць дзесяцігоддзяў — тэрмін значны. Залечаны страшэнныя раны, нанесеныя Беларусі за гады Вялікай Айчыннай вайны — адной з найбольш кровапралітных за ўсю гісторыю развіцця чалавечай цывілізацыі. Выраслі новыя пакаленні людзей, для якіх вайна — гэта ўспаміны нямногіх з тых, каму пашчасціла дажыць да юбілею, хто сваёй ратнай працай набліжаў час вызвалення, ды скупыя радкі школьных падручнікаў

аб перамогах і стратах. Пад шматлікімі абелiскамі, што ўзвышаюцца маўклівымі сведкамі непамернага гора, спачывае вечным сном на беларускай зямлі той, чыё раптам абарваўшаеся жыццё — гэта наша свабода. І пакуль мы помнім сябе, мы проста не маем права ў буднях жыцця, горычы няўдач і радасцей дасягненняў забыць тых, хто дараваў нам свабоду, магчымасць творча жыць і працаваць, выпраўляць свае памылкі, выхоўваць дзяцей. Інакш у нашым жыцці губляецца ўсякі сэнс.

Гісторыя рэдка бывае такой дакладнай — менавіта ў Беларусі, дзе ў жахлівыя чэрвеньскія дні трагічнага 1941 г. апынуліся ў акружэнні дзесяткі тысяч воінаў Заходняй Асобнай ваеннай акругі, роўна праз тры гады, у чэрвені 1944 г. папалі ў акружэнне шматлікія арміі агрэсараў, што хацелі ўсталяваць сусветнае германскае панаванне. З 23 чэрвеня па 29 жніўня савецкае камандаванне прыступіла да ажыццяўлення летняга наступлення ў Беларусі пад кодавай назвай «Баграціён» — адной з буйнейшых наступальных аперацый Вялікай Айчыннай вайны.

Летняе наступленне ў Беларусі распрацоўвалася ў Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандавання і Генеральным штабе. У падрыхтоўцы аперацыі прамалі ўдзел І. В. Сталін, Г. К. Жукаў, А. М. Васілеўскі, А. І. Антонаў, А. А. Новікаў, Н. Н Воранаў, К. К. Ракасоўскі, А. В. Хрулёў, Н. Д. Якаўлеў, І. Т. Перасыпкін, Я. Н. Федарэнка і інш.

Распрацоўцы плана надавалася надзвычай вялікая ўвага з боку ваенна-палітычнага кіраўніцтва СССР. Ён меў дастаткова грунтоўную прапрацоўку і некалькі разоў абмяркоўваўся ў Стаўцы. У сваіх успамінах Маршал Савецкага Саюза А. М. Васілеўскі піша: «В течение марта и апреля замысел летней кампании неоднократно обсуждался и уточнялся у Верховного Главнокомандующего. Г. К. Жукова и меня несколько раз вызывали в Москву.

Много раз Верховный Главнокомандующий говорил с нами об отдельных деталях по телефону. При этом Сталин нередко ссылался на свои переговоры по этим вопросам с командующими войсками фронтов, особенно с К. К. Рокоссовским... В начале апреля в одном из разговоров он сообщил мне, что склонен, вопреки возражениям командующего Ленинградским фронтом Л. А. Говорова, снова разделить этот фронт на два... Тогда же он поставил мне и другой вопрос, который обсуждался в Ставке — о разделении Западного фронта...

В первой половине апреля 1944 года Генеральный штаб с разрешения Верховного Главнокомандующего запросил мнение командующих соответствующими фронтами о летней кампании и проведении Белорусской операции... 20 мая, разработанный Генштабом план Белорусской операции, был представлен Верховному Главнокомандующему. Вскоре он был рассмотрен в Ставке с участием некоторых командующих и членов Военных советов фронтов. В ближайшие же дни Генштаб должен был представить уточненный план на окончательное утверждение в Ставку.

Вместе с Г. К. Жуковым и А. И. Антоновым я неоднократно бывал в те дни у Верховного Главнокомандующего. Каждый раз во время этих встреч мы возвращались к обсуждению деталей плана и проведения Белорусской операции, получившей название "Багратион"...

30 мая Ставка окончательно утвердила план операции "Багратион"... Утверждая 30 мая план Белорусской операции, Сталин, как это было уже не раз, заявил, что ближайшая задача Ставки — помочь командованию и войскам фронтов получше подготовить и провести задуманную операцию, а ГКО и Генштаб обязаны принять меры к тому, чтобы своевременно и полностью обеспечить войска всем необходимым.

Он предложил направить Г. К. Жукова и меня в Белоруссию в качестве представителей Ставки и спросил, на какие фронты мы хотели бы поехать... В ночь на 31 мая Сталин, Жуков, я и Антонов отработали в Ставке частные директивы фронтам белорусского направления, указания немедленно приступить к подготовке операции "Багратион" и конкретные задачи на первый этап ее проведения» [1].

Звяртаючыся да гісторыі распрацоўкі плана Беларускай наступальнай аперацыі, нельга не нагадаць такі цікавы эпізод. Так, калі ўжо размова зайшла пра магчымасць ажыццяўлення баявых дзеянняў, у дыскусію настойліва ўключыўся К. К. Ракасоўскі, які выказаў пярэчанне нават І. В. Сталіну. Ва ўспамінах Маршал Савецкага Саюза К. К. Ракасоўскі, якога І. В. Сталін паважаў і нават называў «мой Баграціён», піша аб гэтым: «Верховный Главнокомандующий и его заместители настаивали на том, чтобы нанести один главный удар с плацдарма на Днепре (район Рогачева), находившегося в руках 3-й армии. Дважды мне предлагали выйти в соседнюю комнату, чтобы продумать предложение Ставки. После каждого такого "продумывания" приходилось с новой силой отстаивать свое решение. Убедившись, что я твердо настаиваю на нашей точке зрения, Сталин утвердил план операции в том виде, как мы его представили. "Настойчивость командующего фронтом,— сказал он,— доказывает, что организация наступления тщательно продумана. А это надежная гарантия успеха"» [2].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Прадугледжвалася нанясенне трох магутных удараў: 1-га Прыбалтыйскага — пад камандаваннем генерала арміі І. Х. Баграмяна і 3-га Беларускага — на чале з генерал-палкоўнікам І. Д. Чарняхоўскім франтоў, якія наносілі ахопліваючыя ўдары па віцебскай групоўцы праціўніка ў агульным напрамку на Вільнюс; 1-га Беларускага фронту, якім камандаваў генерал-палкоўнік К. К. Ракасоўскі — на Баранавічы; 2-га Беларускага — пад камандаваннем Г. Ф. Захарава — у напрамку на Мінск. У складзе гэтых чатырох франтоў налічвалася звыш 2 400 тыс. чалавек асабовага складу, войскі мелі 36 400 гармат і мінамётаў, 5 200 танкаў і самаходных гармат, 5 300 баявых самалётаў. Нараўне з войскамі Чырвонай Арміі актыўныя баявыя дзеянні разгарнулі беларускія партызаны і жыхары прыфрантавых населеных пунктаў. За тры дні да пачатку наступлення яны ажыццявілі масавы падрыў і разбурэнне варожых камунікацый, вялі барацьбу з гітлераўцамі да поўнага вызвалення Беларусі.

Гэтай магутнай сіле супрацьстаялі германскія арміі групы «Цэнтр» пад камандаваннем генерал-фельдмаршала Э. Буша, якога пазней замяніў генерал-фельдмаршал В. Модэль. У складзе германскіх войск налічвалася 1,2 млн чал., 9500 гармат і мінамётаў, 900 танкаў і штурмавых гармат. Наземныя войскі падтрымлівалі 6-ы і частку сіл 1-га і 4-га паветраных флотаў (1350 самалётаў).

22 чэрвеня 1944 г. за дзень да пачатку агульнага наступлення была праведзена разведка боем. На фронце працягласцю 450 км адначасова дзейнічала 45 разведвальных падраздзяленняў. З 23 чэрвеня па 29 жніўня войскі Чырвонай Арміі прарвалі абарону праціўніка на многіх напрамках, загналі яго ў «кацёл» у раёнах Віцебска, Полацка, Бабруйска, Магілёва, Мінска, Брэста, Вільнюса і выйшлі да граніц Усходняй Прусіі. Хроніку падзей аперацыі «Баграціён» можна даследаваць бясконца.

Лічбы і шматлікія факты не павінны засланяць дзейнасць людзей, для якіх галоўнай мэтай было выжыць, каб змагацца дзеля жыцця. Нельга забыць тых, хто жывымі гарэлі ў танках, развіталіся ў апошнім піке з сябрамі, кідаліся на варожую амбразуру, хто ахвяраваў сваё жыццё не за ўзнагароды і лампасы, а дзеля свабоды краіны і свайго народа. Сярод тых, хто граміў германскіх захопнікаў, былі дзесяткі тысяч герояў. Радзіма высока ацаніла гераізм воінаў Чырвонай Арміі ў баях за вызваленне Беларусі: больш за 1500 генералам, афіцэрам і салдатам прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, у ліпені — жніўні 1944 г. ордэнамі і медалямі ўзнагароджаны больш за 402 тыс. воінаў. Больш за 600 вайсковых часцей і злучэнняў атрымалі *ганаровыя найменні.*

Аналізуючы вынікі Беларускай наступальнай аперацыі, германскія газеты, нягледзячы на жорсткую цэнзуру ваеннага часу, вымушаны былі прызнаць, што ў непакоранай Беларусі адбылася бітва «апакаліпснага» характару. У ходзе аперацыі савецкія войскі знішчылі цалкам 17 дывізій і 3 брыгады, 50 дывізій страцілі больш за палову свайго складу, разграмілі нямецкую групу армій «Цэнтр». Ход вайны быў беспаваротным.

*ЛІТАРАТУРА*

1. *Василевский А. М.* Дело всей жизни. М., 1977. С. 418—422.
2. *Рокоссовский К. К.* Солдатский долг. Мн., 1984. С. 237.

*SUMMARY*

*The war plan «Bagration»'s preparation and the results of its fullfillment are viewed in the article.*

*УДК 947.6(476.4)*

***Г. І. Валчок***

# УЗАЕМАДЗЕЯННЕ ПАРТЫЗАН МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ З ЧАСЦЯМІ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ Ў ХОДЗЕ БЕЛАРУСКАЙ НАСТУПАЛЬНАЙ АПЕРАЦЫІ

Разграміўшы гітлераўцаў на Курскай дузе, Чырвоная Армія, паспяхова наступаючы, восенню 1943 г. дасягнула ўсходніх граніц Беларусі. 26 кастрычніка 1943 г. першым у Магілёўскай вобласці быў вызвалены раённы цэнтр Хоцімск, а яшчэ праз некаторы час савецкія войскі ва ўзаемадзеянні з партызанскімі атрадамі вызвалілі Клімавічы, Касцюковічы, Мсціслаўль, Чэрыкаў, Крычаў, Краснаполле, Дрыбін.

5 кастрычніка, па загадзе БШПР, брыгады і атрады партызан, якія дзейнічалі ў час акупацыі